## Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у студзені

Бібліятэкі “Лунінецкая РЦБС” далучыліся да рэспубліканскай дабрачыннай акцыі для пажылых людзей **“Ад усёй душы”**, якая праходзіла з 3 па 14 студзеня.

**3 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** Для членаў клуба “Вдохновение”, які працуе пры Мікашэвіцкім філіяле Лунінецкага ТЦСАН правялі навагоднія вячоркі “Зімовае чараўніцтва”. Прысутныя дзяліліся сакрэтамі сваёй маладосці, сваім досведам у выхаванні дзяцей і ўнукаў, кулінарнымі рэцэптамі.

**8 студзеня. Сітніцкая сельская бібліятэка-клуб.** Прайшла сустрэча для сталых людзей з настаяцелем Мокраўскай царквы Покрыва Прасвятой Багародзіцы, іерэем Аляксандрам. У бібліятэцы-клубе знаходзіўся цудатворны абраз Божай Маці “Феадораўская-Сызранская”.

Супрацоўнікі сельскіх бібліятэк арганізавалі наведванні на даму. Так, бібліятэкары **Кажан-Гарадокскай сельскай бібліятэкі-клуба** наведалі лепшых сваіх чытачоў і ўручылі ім граматы і сувеніры. Бібліятэкар **Палескай сельскай бібліятэкі** павіншавала са святамі сям’ю Масла Марыю Дзям’янаўну і Аляксандра Аляксандравіча (інваліды 2 групы). Бібліятэкар **Люшчанскай сельскай бібліятэкі-клуба** наведала доўгажыхароў вёскі. Кожнаму чытачу яна ўручыла падарачныя каляндары на 2025 год. **Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** наведала на даму інвалідаў-чытачоў Кух Серафіма і Кух Івана.

У перыяд зімовых святаў у РЦБС прайшлі традыцыйныя святочныя мерапрыемствы.

**Студзень. ЦДБ.** З мэтай фарміравання павагі да народных традыцый праз знаёмства з народнымі святамі на ютуб-канале “Лунінецкая цэнтральная бібліятэка” цэнтральнай дзіцячай бібліятэкай быў запушчаны Народны ВідэаКаляндар “Сонцазварот”. Першы выпуск прысвечаны святу Раства Хрыстовага.

**3 студзеня. Мікашэвіцкай г.б.** Прайшла літаратурна-гульнявая праграма “Свет рождественской звезды”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся пра гісторыю свята, яго значэнне і традыцыі, прайшлі квэст-гульню.

**8 студзеня. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки” адбылася сустрэча з настаяцелем храма Казанскай іконы Божай Маці аг.Рэдзігерава, іерэем Аляксандрам Барысавым. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі розных пакаленняў. Усе жадаючыя расказалі аб тым, як праходзілі навагоднія мерапыемствы ў гады іх маладосці.

У **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла фальклорная гадзіна “Святое Рождество нам радость принесло”, у **Ракітненскай** і **Бастынскай** сельскіх бібліятэках правялі конкурсы дзіцячага малюнку, у **Лунінскай** сельскай бібліятэцы адбылася гадзіна забаў “Рождественские истории”, у **Любанскай с.б**. – інтэлектуальна-забаўляльная праграма “Чудеса случаются в Рождество”.

**10 студзеня. ЦДБ.** Праведзена суботняя галерэя “Калядныя сустрэчы”. У час правядзення мерапрыемства дзеці спявалі песні, вадзілі карагод, жадалі дабрабыту і працвітання. Кніжная выстава “Для вас ребятишки, “зимние книжки” дапоўніла калядную сустрэчу у бібліятэцы.
**14 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася паседжанне аматарскага аб’яднання “Читайки”. Супрацоўнікі бібліятэкі ў школе правялі літаратурна-гульнявое падарожжа “Святые Калядкі”. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй і традыцыямі народнага свята. Спявалі песні-шчадроўкі, адгадвалі загадкі “Замарочкі з мяшочка”.
**14 студзеня. ЦБ**. Для выхаванцаў дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН прайшла фальклорная гадзіна “Пришла коляда — отворяй ворота”.
**15 студзеня. ЦБ.** У рамках паседжання народнай літаратурна-паэтычнай студыі у чытальнай зале адбыўся паэтычны калейдаскоп “Моя любовь – мой край Полесский”, прысвечаны 85-годдзю стварэння Лунінецкага раёна. У пачатку мерапрыемства быў прадстаўлены зборнік “Мой любы край – мая Берасцейшчына”, выданы абласной бібліятэкай ім.Горкага да 85-годдзя Брэсцкай вобласці. У зборнік увайшлі творы пяці ўдзельнікаў Лунінецкага раёна: Міраслава Зіміча, Кацярыны Емельяновіч, Ганны Дунчык, Аляксандра Аляксеева і Ліліі Рудзько. Запрошаныя на мерапрыемства ўдзельнікі конкурсу атрымалі гэты зборнік. Далей бібліёграф пазнаёміла прысутных з гістарычнымі падзеямі, якія адбыліся 15 студзеня 1940 года, калі быў утвораны Лунінецкі раён, і прадставіла ўдзельнікам відэа-прэзентацыю “Лунінецкаму раёну – 85 гадоў”.
Таксама у рамках паседжання літаратурна-паэтычнай студыі прайшла прэзентацыя кнігі Вячэслава Майсака “Большая река течёт тихо”.
**23 студзеня. ЦДБ.** У рамках праекта “В мир книг через театр” прайшла займальная творчая сустрэча з лялечным тэатрам бібліятэкі «Весёлая карусель» для выхаванцаў старэйшай групы дзіцячага садка №8. Дзеці паглядзелі і абмяркавалі спектакль па кнізе Артура Кузняцова “Как медведь Новый год встречал”.
**26 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** У рамках праграмы духоўна-маральнага выхавання “По пути к добру и свету” сумесна з нядзельнай школай храма Раства Иаана Прадцечы адбыўся калядны калейдаскоп “Под чистым небом Рождества”.
У другой частцы мерапрыемства для дзяцей правялі ўрок маральнасці “Вирус сквернословия”. Дзеці даведаліся аб прычынах выкарыстання нецэнзурнай лексікі ў сучасным грамадстве, а таксама аб шкодзе брыдкаслоўя.

Прайшлі мерапрыемствы да **Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту.**

**23 студзеня. ЦБ.** 2025 год – гэта год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Цэнтральнай раённай бібліятэкай сумесна з рэдакцыяй газеты “Лунінецкія навіны” і членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўцам і журналістам Таццянай Васільеўнай Канапацкай будзе рэалізаваны ваенна-патрыятычны праект “Рэха нашай памяці”. У рамках гэтага праекта адбылася першае мерапрыемства - гістарычны экскурс “Старонкі гісторыі. Беларусь у

гады Вялікай Айчыннай вайны”. Для вучняў СШ №1 выступілі журналіст, аўтар серыі кніг “Лунінецкая памяць” Т.В. Канапацкая і дырэктар ЧУТП “Еврорейс” Г.Г. Канапацкі. Навучэнцы гімназіі г Лунінца ім.М.П. Анцукевіча прадэманстравалі тэатральную пастаноўку.
**25 студзеня. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася літаратурная гадзіна “Холокост: помнить и никогда не забывать”.
**28 лютага. ЦДБ**. Прайшла літаратурная гадзіна “Пепел войны”. Спачатку бібліятэкары растлумачылі вучням значэнне слова “халакост”, потым распавялі аб жорсткіх эксперыментах над людзьмі, аб мільёнах закатаваных людзей, аб усіх жахах гэтай трагедыі.

У сельскіх бібліятэках раёна таксама прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакосту: літаратурны вечар “Память о жертвах Холокоста” (**Лунінская** сельская бібліятэка), час памяці “Это не должно повториться никогда” (Д**зятлавіцкая** сельская бібліятэка), гадзіна памяці “Мир знает и помнит” (**Межлеская** сельская бібліятэка), гадзіна-рэквіем “Холокост в сердце и памяти народа” (**Дрэбская** сельская бібліятэка-клуб) і інш.